## Дзяржаўная установа адукацыі “Сярэдняя школа №15 г. Ліды”
## Бібліятэка



# Уладзімір Ягоўдзік

***беларускі дзіцячы пісьменнік***

**14 лютага**

**2021 года**

**65 гадоў**

**з дня нараджэння**


















Празаік, драматург, галоўны рэдактар часопісаў “Бярозка” (1997–2003) і “Лесавік” (1995–2010). Лаўрэат Прэміі прафсаюзаў Беларусі (1993), Літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра (1994). Аўтар кніг для дзяцей “Янка і Ружа, “Дзівосны карабель”, “Сем цудаў Беларусі” і інш. Заснаваў серыю аўтарскіх фотакніг “Скарбы Радзімы” (2008–2018), прысвечаных прыродзе Беларусі.

Нарадзіўся 14.02.1956 г. у вёсцы Кастровічы Слонімскага раёна Гарадзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Дзятлаўскай, Слонімскай, Зэльвенскай школах-інтэрнатах, у 1978 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1978-1982 гг. працаваў карэспандэнтам Берасцейскай абласной газеты «Заря», рэдактарам Берасцейскай абласной студыі тэлебачання. З 1982 г. жыве ў Менску. У 1982-1990 гг. - супрацоўнік штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», з 1990 г. - рэдактар газеты «Дзеці і мы». Сябра СП СССР з 1985 г.

Дэбютаваў у друку вершамі ў 1972 г. (газета «Гродзенская праўда»).

Напісаў для дзяцей п'есы, што ставіліся ў лялечных і драматычных тэатрах краіны, на Беларускім радыё і тэлебачанні, «Залатое зярнятка» (пастаўлена ў 1983), «Сонейка, свяці!» (надрукавана і пастаўлена ў 1985), «Пякла баба калачы» (з А.Шкілёнкам, пастаўлена ў 1987), «Сакрэты Вогніка» (пастаўлена ў 1987), «Усміхніся, прынцэса...» (надрукавана і пастаўлена ў 1990).

Выступае ў перыядычным друку як літаратурны крытык, а таксама з мастацтвазнаўчымі артыкуламі пра самадзейных і прафесійных мастакоў рэспублікі.

Пераклаў з расейскай і ўкраінскай моў асобныя творы Л.Лявонава, В.Астаф'ева, Ю.Бондарава, М.Віграноўскага.

**Творчасць Ул. Ягоўдзіка** тэматычна і жанрава багатая. У яго знойдуцца і апрацоўкі легенд і паданняў, творы на сюжэты з народнай міфалогіі і своеасаблівая інтэрпрытацыя народных

казак, уласныя літаратурныя казкі, апавяданні пра канкрэтных гістарычных асоб. Такая разнастайнасць адлюстравання рэчаіснасці прываблівае чытача. Літаратурныя аповесці-казкі Ул. Ягоўдзіка заснаваны на народных матывах. Аднак гэта зусім самастойныя мастацкія творы, паколькі пісьменнік бярэ за аснову звычайныя жыццёва-прыродныя факты і напаўняе іх незвычайным казачным дзействам. Аповесць «Янка і ружа» прасякнута адзінай ідэяй: выхавання дабрачыннасці і ўсталявання прынцыпаў вышэйшай справядлівасці. Прысвечана змаганню за высакародныя справы, супраць заганных звычак і грубай уладнай сілы. Напрыклад, у аповесці «Янка і ружа пісьменнік звяртаецца, няхай і апасродкавана, да гісторыі краю. Тут можна знайсці многа сімвалічных прыкмет Беларусі: Белая вежа як увасабленне дзяржаўнай велічы, светлыя рэкі, зялёныя лясы, працавітыя людзі. А барацьба з тванню – гэта сімвал змагання за Адраджэнне краю пасля многіх гадоў застою, напамінак аб неабходнасці аднаўляць і развіваць нацыянальную беларускую культуру, берагчы і ўмацоўваць родную мову.

Драматургічныя творы У. Ягоўдзіка прысвечаны пераважна маральна-этычнай тэматыцы. Т

Тэматычна творы У. Ягоўдзіка можна падзяліць на два цыклы: казкі пра жывёл і сацыяльна-бытавыя

Пісьменнік Уладзімір Ягоўдзік заснаваў унікальную серыю “Скарбы Радзімы”, у якой ён выдае прыгожыя каляровыя кніжкі на роднай мове для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.

Гэтыя кнігі аўтар прысвячае помнікам прыроды, птушкам і звярам беларускіх лясоў, рэкам, азёрам, лясам і гарадам нашай Бацькаўшчыны. Кніжкі Уладзіміра Ягоўдзіка з серыі “Скарбы Радзімы” ўжо набылі многія школы, садкі і бібліятэкі Беларусі. Серыя налічвае 30 назваў, іх агульны тыраж склаў 89 200 экз.

Нядаўна ў гэтай серыі зноў з'явіліся дзве прыгожыя кніжкі "Крылатыя суседзі" і "Зачараваная Свіслач". Першая з іх прысвечана зімародку, пішчусе, попаўзеню, сойцы, вераб'ям, сінічкам. Сёння, напрыклад, паркі і скверы Мінска насяляюць больш за 100 відаў птушак. Большасць з іх адлятае ў вырай, аднак многія застаюцца. Пра ўсё самае цікавае з жыцця птушак прачытаюць чытачы ў кнізе "Крылатыя суседзі".

Кніжка "Зачараваная Свіслач" прысвечана Свіслачы, выток якой знаходзіцца на Мінскім узвышшы, а даўжыня рэчкі ажно 335 кіламетраў. Аўтар распавядае пра многія падзеі, звязаныя з гэтай рэчкай, пра веснавыя паводкі і падзеі на яе берагах. Кніжкі вельмі прыгожа афармлены, на іх старонках шмат каляровых здымкаў.




Для юных чытачоў сваю чарговую кнігу аб беларускай прыродзе аўтар назваў "Лясныя таямніцы".

У новую кнігу пісьменніка ўвайшлі апавяданні і мініяцюры, прысвечаныя рэкам, азёрам і крыніцам, а таксама Нацыянальным паркам і запаведнікам Беларусі. Але не толькі аб гэтым даведаюцца тыя, каму трапіць у рукі гэта цікавае і прыгожае выданне. Яны даведаюцца пра возера Свіцязь, дзе бывалі школьныя сябры Ян Чачот і Адам Міцкевіч, пра Купалаўскія Акопы, якія восенню 1909 года ўзяла ў арэнду маці Янкі Купалы Бянігна Луцэвіч, пра Коласаўскую Альбудзь, пра Жыровіцкі манастыр і шмат-шмат пра іншыя цікавыя мясціны Беларусі, а таксама пра людзей.

З захапленнем і асалодай юныя і дарослыя чытачы прачытаюць у кнізе Уладзіміра Ягоўдзіка пра зельнік Зоські Верас, а гэта — святаяннік, крываўнік, цыкорыя-мацаўнік, залётнік, васількі, рамонкі, дзівасіл г.д. Напрыклад, калісьці вясковыя знахары гатавалі з васільковых пялёсткаў адвар, які дапамагаў пры хваробе вачэй. А нашы продкі з высушанага

лісця залётніку гатавалі гарбату, і не толькі, каб наталіць смагу. А найперш — каб пазбавіцца ад розных напасцяў-захворванняў…

Аўтар, добры арнітолаг, знаёміць чытачоў з барабаншчыкамі вясны і вядома ж, з адміралам і яго камандай — разнастайнымі матылькамі, якія сустракаюцца ў Беларусі. Кніга вельмі прыгожа аздоблена здымкамі беларускіх фотамастакоў Ігара Бышнёва, Мікалая Гулінскага, Сяргея Чарапіцы, Вільгельма Дубіловіча.

**Бібліяграфія**

«Стронга». Кніга прозы. 1984 г.
«Сонейка, свяці!». Зборнік казак. 1988 г.
«Вочы Начніцы». Кніга прозы. Бібліятэка часопіса «Маладосць», 1989 г.
«Прыручэнне птушкі». Кніга прозы. 1989 г.
«Алена Кіш». Мастацкі альбом. 1990 г.
“Заклятыя Скарбы”. 1992 г.
“Ці вернецца князь Кук?”. 1993 г.
“У царстве Вадзяніка”. 1995 г.
“Дзівосны карабель”. 1995 г.
“Вужовы кароль”. 1996 г.
“Сем цудаў Беларусі”. 1999 г.
“Птушыная дарога”. 2002 г.
“Жывая вада крыніц”. 2009 г.
“Вячэра для вожыка”. 2013г.
“Лясныя таямніцы”. 2014 г.
“Кветкі дзівасілу”. 2018 г.
“Зачараваная Свіслач”. 2018 г.
“Крылатыя суседзі”. 2018 г.